СПИСОК ИСПОЛЬЗОВАННЫХ ИСТОЧНИКОВ

1. Огилви, Д. О рекламе / Д. Огилви. – М. : Эксмо, 2003. – 235 с.

2. Панкаратов, Ф. Г. Рекламная деятельность / Ф.Г. Панкратов, Т.К. Серегина, В.Г. Шахурин. – М. : Инфра-М, 2011. – 210 с.Райзберг, Б.А. Современный экономический словарь / Б.А.

3. Райзберг, Л.Ш. Лозовский, Е.Б. Стародубцева. – М. : ИНФРА-М, 2010. – 910 с.




Рисунок 1. Логотип

Канапацкий А.В., студент 150 группы
дневной формы обучения
Научный руководитель – Бомбешко И.И.,
кандидат культурологии, доцент кафедры

**АСОБА Ў БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫІ: КАНСТАНЦІН АСТРОЖСКІ**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Канстанцін Іванавіч Астрожскі — ваеначальнік, дзяржаўны дзеяч Вялікага Княства Літоўскага Рускага і Жамойцкага [2, с. 76]. Род Астрожскіх вядзе свой род ад турава-пінскіх князёў. Пачынальнікам роду быў пінскі князь Уладзімір. Прозвішча род атрымаў ад горада Астрога. Амаль усе прадстаўнікі мужчынскай часткі роду Астрожскіх, як і належала дваранству, займалася вайсковай справай, што і вызначыла далейшы лёс Канстанціна Іванавіча. Бацькам К. І. Астрожскага быў Іван Астрожскі, а маці была ж княгіняй з роду Глінскіх Настасся Глінская. У 1454 г. пад Церабоўляй Іван Астрожскі перамог крымскіх тарат і тым самым выратаваў дзевяць тысяч чалавек з татарскай няволі. Ад Настассі Глінскай Іван Астрожскі меў двух сыноў – Міхаіла і Канстанціна, нас цікавіць вядома апошні, што нарадзіўся ў 1460 г. [3, с. 7].

Аб дзяцінстве гетмана інфармацыя практычна адсутнічае, аднак вядома, што калі Канстанціну было амаль сем гадоў з ім здарылася няшчасце: яго бацькі памерлі, а выхаванне лягло на старэйшага брата Міхаіла і баяр. У 1486 г. абодва браты трапілі ў Вільню, да двары вялікага князя Казіміра [3, с. 8-17].

Першымі праціўнікамі, з якімі змагаўся К. І. Астрожскі, былі татары. Так, у 1491 г., калі конніца Вялікага Княства Літоўскага пад камандванем Сямёна Гальшанскага дагнала татараў пад горадам Ізяслаў і разбіла іх дазвання. У гэтай бітве будучы вялікі гетман паказаў сабе найлепшым чынам.

У гэты час на ўсходзе набірала моц Маскоўскае княства, якое мела на мэце –збор Русі” і лічыла тэрыторыю Беларусі і Украіны сваімі, таму актыўна сачыла за палітычным становішчам на тэрыторыі Вялікага княства. Калі 7 ліпеня 1492 г. Вялікі князь Казімір Ягайлавіч памёр, то праз кароткі час тры вялікія рускія арміі перайшлі мяжу, захапіўшы некалькі гарадоў ВКЛ. Аляксандр не хацеў вайны, таму накіраваўщ да Івана III паслоў, каб спыніць вайну. Перамовы аказаліся паспяховымі і вынікам стала перамір’е ў 1494 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аднак пасля сканчэння вайны зноў пачаліся набегі крымскія татар, з якімі змагаўся Канстанцін Іванавіч. У 1496 г. татараў прыйшло вельмі шмат, што пранесліся аж да Луцка. Атрады К. Астрожскага, С. Гальшанскага і В. Храптовіча былі вымушаны схавацца ў мурах замка Роўна і аддаць татарам вялізны выкуп. Аднак праз пэўны час ўжо К. Астрожкі тройчы перамог над татарамі. З за свае паслугі перад дзяржавай ён у трыццаць сем гадоў атрымаў пасаду гетмана, што было ўпершыню ў гісторыі ВКЛ ніхто яшчэ перад Астрожскім не атрымліваў гэту пасаду ў такім узросце [3, с. 40-43].

У 1499 г. войскі Маскоўскага княства парушылі перамір'е, зноў пачалася новая вайна, у якой К. А. Таксама як гетман прыняў актыўны ўдзел. 7(14) ліпеня 1500 г. адбылася рашучая бітва на Міцькіным полі ля ракі Вядрошы. Сілы бакоў былі няроўныя, і змагаліся войскі вельмі адчайна, перамога пераходзіла з рук у рукі, але ўсё вырашыў засадны поўк Маскоўскага княства, што прынёс перамогу ваяводы Д. Шчэні. Многія знатныя людзі, ў тым ліку і гетман К. І. Астрожскі, тратілі ў палон [1, с. 16-17].

У выніку ВКЛ прайграла вайну, былі страчаны Чарнігаў, Ноўгарад-Северскі, Бранск, Любеч, Гомель, Старадуб, Мцэнск, Рыльск і г.д. [3, с. 69-70]. Самаго Канстанціна Іванавіча не збіраліся выдаваць, таму ён быў вымушаны паступіць на службу да Івана III, каб нарэшце атрымаць волю. Пасля смерці Івана III, К. І. Астрожскі вымушаны быў падпісаць пісьмовую прысягу на вернасць Васілю III. Затым яго адправілі змагацца супраць татар, так поступова К. І. Астрожскі змог самастойна адлучацца па справах.

У жніўні 1507 г. К. І. Астрожскі выехаў на Севершчыну, быццам бы пракантраляваць пільнасць маскоўскіх залогаў. Так пачаўся яго апошні кідок да волі, ён абмінаў гарады ды людныя дарогі каб не прыцягваць увагу, ён вяртаўся на радзіму. Калі гетман вярнуўся на сваю радзіму, гэтая навіна выклікала радасць Жыгімонта I, які адразу ж вярнуў К. І. Астрожскаму

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Брацлаўскае стараства. Таксама К. І. Астрожскі аттрымаў пасады старасты луцкага і маршалка валынскага, але самым важным вядома было вяртанне чына гетмана [3, с. 79-84].

У гэтым жа годзе адбыўся бунт М. Глінскага, які быў выкліканы адхіленнем яго ад усіх пасад Жыгімонтам І Старым пад уплывам абвінавачанняў, выказаных Я. Забярэзінскім. У выніку М. Глінскі вымушаны быў прыняць падданства Васіля ІІІ, а ў  пачатку мая 1508 г. М. Глінскі пры падтрымцы маскоўскіх войскаў рушыў на Мінск і захапіў яго. Гэтыя падзеі вымусілі аб’явіць мабілізацыю ў ВКЛ. Гетман К. І. Астрожскі з войскам рушыў на М. Глінскага. 20 чэрвеня 1508 г. войска К. І. Астрожскага увайшло ў Мінск. М. Глінскі разам з маскоўскімі войскамі пачаў адступаць на ўсход. Гетман пераследваў войскі праціўніка да Оршы. Пасля адступленне сіл Масквы пад Оршай, Жыгімонт Стары вырашыў не даганяць праціўніка, а ісці адразу на Смаленск. Са Смаленска гетман К. І. Астрожскі разам з польскім гетманам М. Фірлеем рушылі на Севершчыну, вяртаць адабраныя землі, аднак гэта не мела поспеху. 8 кастрычніка 1508 г. быў падпісаны ―Вечны мір” з Маскойскім княствам. Аднак М. Глінскі, які знаходзіўся яшчэ пад Мазыром, наклікаў крымскіх татар, якія неўзабаве былі разбіты войскам К. І. Астрожскага. Сам М. Глінскі пасля гэтага эвакуіраваўся разам са сваякамі ў Маскву [3, с. 85-91].

Наступны перыяд быў дастаткова мірным у жыцці гетмана, які вырашыў заняцца гаспадарчымі справамі ў сваіх уладаннях. У 1509 г. гетман ажаніўся з Тацянай Гальшанскай, дачкой новагародскага ваяводы князя Сымона Гальшанскага і сястрой віленскага кашталяна князя Аляксандра Гальшанскага. Такім чынам К. І. Астрожскі парадніўся з адных самых найбуйнейшых радоў. Шлюб з прадстаўніцай роду Гальшанскіх дазволіла яму атрымаць пасля смерці Аляксандра Гальшанскага статус кашталяна віленскага. Канстанцін Іванавіч Астрожскі ўваходзіў у кола ўрадавай эліты Вялікага Княства Літоўскага, сядзеў на першай лаве паноў-рады. Аднак у

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1509 г. зноў пачаліся напады татараў на землі ВКЛ. Асабліва трывожным быў 1512 г. На Валынь адправілася 25-тысячная армія, супраць якой адправілі войска К. А. Астрожскага. 28 красавіка 1512 г. адбылася бітва пад Вішняўцом.

Увосенью 1512 г. зноў пачалася вайна паміж ВКЛ і Маскоўскім княствам. Самай значнай падзеяй гэтай вайны стала бітва пад Оршай, якая адбылася 8 верасня 1514 г. і ў якой чарговы раз праявіўся ваенны палент К. І. Астрожскага. 3 снежня 1514 г. Вялікі гетман Канстанцін Іванавіч Астрожскі трыумфальна вярнуўся ў Вільню [1, с. 22]. Узімку 1526/27 гг. татары зноў уварваліся ў ВКЛ. Ужо стары гетман хутка мабілізаваў войска і сустрэў татар каля Пінску, дзе апошнія былі чарговы раз разбіты. У студзені 1527 г. гетман К. І. Астрожскі рушыў конніцай ад Астрога, дзе ѐн здабыў апошнюю перамогу ў сваім жыцці. Да сваіх апошніх дзѐн К. І. Астрожскі дапамагаў новым гетманам сваім багатым досведам [3, с. 172-176]. Канстанцін Астрожскі памѐр 11 верасня 1530 года ў Тураве. Пахавалі яго ў Кіева-Пячэрскай лаўры пад прыгожым рэнесансным надмагіллем. У эпітафіі на ім Астрожскі называецца Сцыпіѐнам Рускім. Аддаючы даніну памяці ягонай палітычнай дзейнасці, асноўны фокус у эпітафіі скіравалі менавіта на вайсковыя заслугі князя.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Багадзяж, М. Сыны зямлі беларускай / М. Багадзяж. – Мінск : Народная асвета, 2002. - 94, [2] с.
2. Ваенная энцыклапедыя Беларусі / [складальнікі: В. Ц. Осіпаў і інш. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 2010. –- 1132 с.
3. Сагановіч, Г. М. Айчыну сваю баронячы: Канстанцін Астрожскі / Г. М. Сагановіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 60, [2] с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ